**ЦАДРО́ЎСКІ** Ян (3.3.1617, в. Пагост Салігорскага р-на Мінскай вобл. — 29.1.1688), грамадскі дзеяч ВКЛ, пісьменнік-мемуарыст. Вучыўся ў Крулявецкім (г. Кёнігсберг, з 1631) і Ягелонскім (г. Кракаў, з 1636) ун-тах. У 1637—69 на службе ў кн. Б.Радзівіла, суправаджаў яго ў падарожжы за мяжой. З 1643 радзівілаўскі ўраднік у Старой Вёсцы на Падляшшы. Удзельнік вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67, у 1656 пасол ад мінскай шляхты да цара Аляксея Міхайлавіча. Выбіраўся паслом на соймы, дэпутатам Трыбунала ВКЛ. Пісаў на польскай мове. Аўтар мемуараў (без назвы) пра падзеі 1617—82 у 2 частках: 1-я (скончана ў 1672) змяшчае сціслыя звесткі пра грамадска-паліт. дзейнасць аўтара, падзеі часоў вайны з Расіяй; 2-я (скончана ў 1682) складаецца пераважна з запісаў пра смерць сваякоў і знаёмых Ц., у ёй апісана расправа католікаў над віленскімі кальвіністамі ў 1682. Мемуары апубл. ў 1855 у час. «Временник императорского Московского общества истории и древностей российских» (кн. 23).

*Тв.*: Бел. пер. — Успаміны // Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн., 1983. *В.С.Пазднякоў.*

**ЦАЙДА́МСКАЯ КАТЛАВІ́НА**, Цайдам, тэктанічная міжгорная ўпадзіна ў Цэнтр. Азіі, у Кітаі. Акаймавана гарамі Наньшань, Куньлунь, Алтынтаг. Размешчана на выш. 2600—2900 м. Даўж. каля 700 км, шыр. да 300 км. Пясчана-гліністая раўніна з асобнымі ўваламі, участкамі *бедленда*, формамі эолавага выветрывання. Паўд.-ўсх. ч. катлавіны аддзелена ад паўн.-зах. уступам выш. 100 м, мае больш нізкі рэльеф, коркавыя саланчакі (пл. да 1600 км$^2$), што ўзніклі на месцы стараж. азёр. Клімат рэзка кантынентальны. Сярэднія т-ры студз. да -15 °С, ліп. да 18 °С. Ападкаў 25—50 мм за год, на У да 150 мм. Зіма бясснежная. Паўн.-зах. ч. практычна бязводная, на ПдУ у паніжэннях саланчакоў азёры (напаўняюцца вадой у час летняй паводкі). Горныя пустыні і стэпы.

**ЦАКО́НІ** (Zacconi) Эрметэ (14.9.1857, г. Мантэк'ё, Італія — 14.10.1948), італьянскі акцёр, прадстаўнік натуралістычнага кірунку ў т-ры. З 1873 выступаў у вандроўных трупах, у т.л. ў трупе Э.*Дузе*. Шмат гастраліраваў. У сваёй творчасці імкнуўся да паглыбленай трактоўкі вобразаў, падкрэсліваў псіхічныя і фіз. пакуты герояў. Сярод роляў: Мікіта («Улада цемры» Л.Талстога), Кузаўкін («Нахлебнік» І.Тургенева), граф ды Ракамонтэ («Веер» К.Гальдоні), Сакрат («Пахвала Сакрату» Платона), Гамлет, Макбет (аднайм. п'есы У.Шэкспіра), Освальд («Здані» Г.Ібсена). З 1912 здымаўся ў кіно.

**ЦАЛІКО́ЎСКАЯ** Людміла Васілеўна (8.9.1919, г. Астрахань, Расія — 4.7.1992), расійская актрыса. Нар. арт. Расіі (1963). З 1937 вучылася ў студыі Т-ра імя Я.Вахтангава, з 1942 у трупе гэтага т-ра (Масква). Яе мастацтву ўласцівы музыкальнасць, выразная пластыка, абаяльнасць, душэўная тонкасць, мяккі гумар. Іграла тонкапсіхал. і вострахарактарныя ролі: Беатрычэ і Джульета («Многа шуму з нічога» і «Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра), Інкен Петэрс («Перад заходам сонца» Г.Гаўптмана), Аглая («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), Мядынская («Фама Гардзееў» паводле М.Горкага), Эліза («Саламяны капялюшык» Э.Лабіша) і інш. З 1939 здымалася ў кіно: «Антон Іванавіч сярдуе» (1941), «Сэрцы чатырох», «Блізняты», «Іван Грозны» (усе 1945), «Скакуха» (1955), «Лес» (1980, вып. 1987) і інш.

*Літ.*: Вострышев М. Чарующая Целиковская. М., 2000.

**ЦАЛІНА́**, зямельныя ўгоддзі, прыдатныя да с.-г. выкарыстання, якія ніколі не засяваліся ці доўгі час (стагоддзі) не апрацоўваліся (гл. *Аблога*), пакрытыя прыроднай расліннасцю. У параўнанні са стараворнымі землямі глебы Ц. маюць павялічаную колькасць гумусу, азоту і інш. элементаў жыўлення раслін, яны больш структурныя і ўшчыльненыя, менш засмечаны насеннем пустазелля, маюць зніжаную біял. актыўнасць і своеасаблівы водны рэжым (у засушлівых раёнах мацней высушаныя, у вільготных — больш увільготненыя).

**ЦАЛІНАГРА́Д**, назва г. Астана ў Казахстане ў 1961—92 (у 1992—98 наз. *Акмала*).

**ЦА́ЛЯ**, адзінка даўжыні ў брытанскай сістэме мер, роўная 1/12 *фута* (25,4 мм). Абазначаецца ". У ВКЛ карысталіся Ц., роўнай 2,7 см. У Расіі выкарыстоўваліся пад назвай дзюйм (ад галанд. duim, літар. — вялікі палец) да ўвядзення метрычнай сістэмы побач з *аршынам* і футам.

**ЦА́МБЛАК** Грыгорый [свецкае імя Гаўрыіл; каля 1364, г. Вяліка-Тырнава, Балгарыя — 1419(20?], царкоўны дзеяч, балгарскі і стараж.-рус. пісьменнік. Пісаў на царк.-слав. мове. Царк. адукацыю атрымаў у Афоне (Грэцыя). З 1393 на царк.-адм. пасадах у Канстанцінопалі, Малдове, Сербіі. З 1415 мітрапаліт кіеўскі і ў ВКЛ. Каля 1416 перанёс цэнтр мітраполіі з Кіева ў Вільню, рэзідэнцыю ў г. Навагрудак. Прадстаўнік Тырнаўскай літ. школы. Аўтар больш як 40 твораў (зберагліся больш за 20), пераважна панегірычна-дыдактычных «слоў», напісаных у стылі «пляценне славес»: «Пахвальнае слова Яўфімію Тырнаўскаму» (1416—17), «Надмагільнае слова святому Дзмітрыю», «Як трымаюць веру немцы» і інш. Творы Ц. напісаны вобразнай мовай, багатыя метафарамі, параўнаннямі, антытэзамі, складанымі фігурамі; бытавалі ў шматлікіх рукапісных зб-ках. З бібліятэк Супрасля, Жыровіч, Вільні захавалася больш за 200 зб-каў з яго творамі, шэраг з іх бел. паходжання. Творчая спадчына Ц. паўплывала на развіццё бел. аратарскай прозы, садзейнічала ўмацаванню культ. сувязей усх. і паўд. славян, пашырэнню паўд.-слав. літ. уплываў на Русі.

*Тв.*: Похвално слово за Евтимий... София, 1971; Житие на Стефан Дечански... София, 1983.

*Літ.*: Яцимирский А. Григорий Цамблак. СПб., 1904; Мечев К. Григорий Цамблак. София, 1969; Лапіцкі М. Праваслаўе ў Вялікім княстве Літоўскім з часоў панаваньня Уладыслава Ягайлы. Нью-Йорк, 1978. *В.А.Чамярыцкі.*

**ЦАМЯ́НКА**, будаўнічы, звычайна вапнавы раствор з дамешкай дробнатоўчанай чырвонай цэглы для муроўкі і тынкоўкі сцен, іх грунтоўкі пад фрэскавы жывапіс. Такі раствор выкарыстоўвалі фінікійцы (10 ст. да н.э.) для гідраізаляцыі вадасховішчаў і водаправодаў; Ц. пашырана ў буд-ве Стараж. Грэцыі і Рыма, у манум. буд-ве Візантыі. На Беларусі ўжывалася з 11—12 ст. у муроўках: мяшанай, са «схаваным радам», дэкар. мяшанай, раўнарадавай (Полацк, Віцебск, Тураў, Навагрудак, Гродна). У выніку чаргавання бледна-ружовых палос Ц. і чырвонай *плінфы* паверхня сцяны мела дэкар. выгляд (Сафійскі сабор і Спаса-Праабражэнская царква Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку). Ц. ўжывалася часам у буд-ве канца 16 — пач. 17 ст. (палац у Старым замку ў Гродне). *А.А.Трусаў, М.М.Цэйтліна.*

**ЦАНА́**, грашовае выяўленне кошту адзінкі тавару (прадукцыі вырабаў, паслуг і інш.). Узровень Ц. вызначае рэнтабельнасць прадпрыемства, яго жыццяздольнасць і фін. стабільнасць. Фарміруецца ў залежнасці ад сумы выдаткаў вытв-сці і сярэдняга прыбытку на авансаваны капітал, попыту і прапановы, магчымасцей рынку, яго тыпу, ёмістасці і інш. фактараў.

У практыцы цэнаўтварэння вылучаюць наст. мэты фарміравання Ц.: арыентацыя на збыт, калі вытворца (прадавец) зацікаўлены ў максімізацыі долі тавару на рынку, росце аб'ёмаў продажу; арыентацыя на атрыманне максімальнага прыбытку; арыентацыя на існуючае становішча, калі вытворца імкнецца пазбегнуць неспрыяльных уздзеянняў знешняга асяроддзя (канкурэнцыя, падаткаабкладанне і інш.). Асн. віды Ц.: адпускныя, закупачныя, *рознічныя цэны*. Ц. можа быць свабодная (фарміруецца прадпрыемствам ці інш. суб'ектам гаспадарання, зыходзячы з выдаткаў вытв-сці, попыту і прапановы, памеру аптовай і гандл. надбаўкі, умоў пастаўкі, плацяжоў, кан'юнктуры рынку, сезоннага попыту і інш. фактараў), фіксаваная (рэгулюецца органамі цэнаўтварэння), дагаворная (кантрактная, устанаўліваецца ў дагаворы паміж пакупніком і прадаўцом). Адрозніваюць таксама Ц.: прэйскурантныя (устанаўліваюцца органамі цэнаўтварэння ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй і ўключаюцца ў спец. зборнікі-прэйскуранты), намінальныя (Ц. тавару, пазначаныя ў прэйскуранце або на тавары), пакупніка або прадаўца (фактычная грашовая сума куплі ці продажу тавару на рынку), зменныя (устанаўліваюцца ў залежнасці

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ